

**_Марыя Шчаўкун_**
загадчыца аддзела пісем рэдакцыі
раённай газеты "Савецкае Палессе"

***Васіль Фёдаравіч Праскураў , з якім і мне выпала працаваць, быў сапраўдным майстрам слова. І ён вельмі цаніў тых, хто ўмела карыстаўся агромністым слоўнікавым запасам роднай мовы. Вычытваючы газетныя палоскі, ён прыкмячаў усе шурпатасці і моўныя недакладнасці ў нашых матэрыялах. Бывала, пераставіць месцамі словы ці замяніць адно другім, спросціць наш мудрагеліста доўгі сказ – і зусім па-іншаму чытаецца тэкст.***

***Радаваўся, калі з-пад пяра журналістаў выходзілі выпеставаныя душой і сэрцам, адшліфаваныя матэрыялы. Памятаю, прыехала на пачатку 80-х гадоў да нас у камандзіроўку студэнтка факультэта журналістыкі БДУ Г. М. Ельская. Пабывала ў Борках, сустрэлася з жанчынай, якую асіраціла вайна, і напісала матэрыял "Радня". Даслала ў "Савецкае Палессе". Прачытаў Праскураў і бачна было, спадабаўся яму ён, як узрадаваўся ён замалёўцы студэнткі. "Чытайце, вучыцеся,"- гэтыя словы яго былі найвышэйшай пахвалой.***

*Пісаў Васіль Фёдаравіч нарысы, у маладосці– вершы. І вельмі любіў паэзію. У аддзеле пісем некалі працавала пераважна моладзь. Рэдактар дазваляў хвілінкі адпачынку ў творчай працы журналістаў. Тут, бывала, найчасцей і збіраліся пасядзець, адпачыць. І Васіль Фёдаравіч заводзіў размову пра паэзію, шмат чытаў на памяць. Здаралася, рабочы дзень ужо заканчваецца, а нізкі вершаў, якія ён ведаў і чытаў, не карацеюць. З маладым журналістам Мікалаем Ефімовічам, бывала, бясконца маглі чытаць Твардоўскага,Ясеніна і многіх іншых.*

*Любіў рэдактар гасцінна сустракаць паэтаў і пісьменнікаў, дзеячаў культуры. І яны ахвотна заязджалі ў нашу рэдакцыю. Тут і я пабачыла Міхася Рудкоўскага, Міколу Купрэева, Святлану Алексіевіч, Ігара Лучанка і іншых, для каго ўтульная драўляная веранда і бэз ля яе былі спакойным прыстанкам на шляху дарог-вандроўніц.*